**І. Р. КАЗАЧЭНКА,**
настаўнік-метадыст Лельчыцкай раённай гімназіі

# ДЫДАКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДА ЎРОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ў VII класе

Падвышэнню цікавасці да ўрокаў беларускай літаратуры спрыяе займальная форма іх правядзення. Для гэтага мэтазгодна выкарыстоўваць розныя метадычныя прыёмы і віды заданняў творчага характару. Прыём **«Пірамідная гісторыя»** дазваляе стварыць апору для звязнага выказвання вучняў, дае магчымасць узнавіць змест твора. Таксама ён дапамагае лагічнай, паслядоўнай пабудове тэксту; яго можна выкарыстаць пры напісанні сачынення, падрыхтоўцы водгуку. У ходзе прэзентацыі «пірамiды» адбываецца абмеркаванне гісторыі (ці вызначальнага моманту сюжэта, канфлікту і г. д.), героя твора, абмен думкамі, сістэматызуюцца веды навучэнцаў.

**Алгарытм складання «пірамiднай» гісторыі**



**1 СЛОВА**
(ІМЯ ПЕРСАНАЖА ГІСТОРЫІ)

**2 СЛОВЫ**,
ЯКІЯ АПІСВАЮЦЬ ГЕРОЯ (ЗНЕШНАСЦЬ, УЗРОСТ, РЫСЫ ХАРАКТАРУ, ЯКАСЦІ)

**3 СЛОВЫ**,
ЯКІЯ АПІСВАЮЦЬ МЕСЦА ДЗЕЯННЯ (КРАІНА, МЯСЦОВАСЦЬ, ГРАМАДСКІЯ МЕСЦЫ)

**4 СЛОВЫ**,
ЯКІЯ АПІСВАЮЦЬ ПРАБЛЕМУ ГІСТОРЫІ

**5 СЛОЎ**,
ЯКІЯ АПІСВАЮЦЬ ПЕРШУЮ ПАДЗЕЮ (ШТО З'ЯВІЛАСЯ ПРЫЧЫНАЙ ПРАБЛЕМЫ ГІСТОРЫІ)

**6 СЛОЎ**,
ЯКІЯ АПІСВАЮЦЬ ДРУГУЮ ГІСТОРЫЮ (ШТО АДБЫВАЕЦЦА З ГЕРОЕМ ПА ХОДУ СЮЖЭТА)

**7 СЛОЎ**,
ЯКІЯ АПІСВАЮЦЬ ТРЭЦЮЮ ПАДЗЕЮ (ШТО РОБІЦЦА ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ ПРАБЛЕМЫ)

**8 СЛОЎ**,
ЯКІЯ АПІСВАЮЦЬ ВЫРАШЭННЕ ПРАБЛЕМЫ

Адным з кампанентаў інавацыйных тэхналогій навучання з'яўляецца **асацыятыўны метад**, які можна актыўна выкарыстоўваць на ўроках беларускай літаратуры. Гэты метад рэалізуецца праз асацыятыўныя вобразы.

У сваёй практычнай дзейнасці выкарыстоўваю заданні на асацыятыўнае мысленне па некалькіх прычынах: вучні не заўсёды дакладна разумеюць тое, што чытаюць; яны не заўсёды могуць сфармуляваць сваю думку, пры гэтым тэкст з асацыяцыямі ўспрымаецца намнога лягчэй. Такія заданні мэтазгодна прымяняць у тых выпадках, калі складана пабудаваць сэнсавыя сувязі ці калі іх трэба «падтрымаць» асацыяцыямі. З гэтай мэтай на ўроках беларускай літаратуры прапаную вучням карты асацыяцый.

У VII класе пры вывучэнні апавядання І. Навуменкі «Настаўнік чарчэння» для лепшага разумення вобразаў прапаную наступныя карты асацыяцый з выявамі і пытаннямі да іх.

*Цыркуль* — асацыяцыі да вобраза Апалінарыя Феакціставіча. Пытанне: «Назавіце асацыяцыю з гэтым прадметам». Вучні тлумачаць, што Цыркуль — празванне настаўніка чарчэння не толькі таму, што гэта прылада для чарчэння, але і па знешнім падабенстве: «Высокі, тонкі, у чорным, яшчэ царскіх часоў, сурдуце, Апалінарый Феакціставіч знешне на самай справе апраўдваў дадзенае яму празванне».

*Дзеці і кніга*. «Чым аб'яднаны гэтыя вобразы ў апавяданні? Дадайце трэцяе слова». Вучні прыгадваюць цытату: «Словы свабода, кніга і дзеці на лацінскай мове маюць блізкае гучанне, — натхняўся стары настаўнік, — лібэрас, лібэра, лібры… Гэта ж так лёгка запомніць…»

*Партрэт Авідзія*. «Хто такі Авідзій? Чаму так захапляўся ім настаўнік?» Вучні ўспамінаюць словы Апалінарыя Феакціставіча: «Авідзій любіў сваю зямлю, як можа яе любіць вялікі сын сваёй Айчыны, — натхняўся стары настаўнік. — Таму яго слова будзе жыць

да таго часу, пакуль будзе ўладарыць чалавек на зямлі».

*Табакерка з надпісам на лацінскай мове.* «Успомніце, з якой нагоды з'яўляецца ў апавяданні гэты прадмет і якія словы напісаны на ім». Вучні тлумачаць, што гэта развітальны падарунак аднакласнікаў Косцю Кветку. Словы на ім перакладаюцца так: «Радзіму нашу любім і абараняць яе павінны».

*Арол і гіена*: «Лічыцца, што гэта птушка падымаецца ў паветры вышэй за іншых. Раскажыце пра гэты вобраз у апавяданні»; «Гіена — сімвал драпежніцтва, захопніцтва. Як гэты вобраз з'яўляецца ў апавяданні?» Вобраз арла вучням растлумачыць няцяжка: гэта птушка можа падымацца вышэй за іншых. У апавяданні звяртаецца ўвага на тое, што на касках фашысцкіх салдат ёсць выява арла. Значэнне вобраза гіены тлумачыцца на карце асацыяцый. Такім чынам, вучням становіцца зразумелай фраза настаўніка чарчэння «У вашых салдат на шапках арлы, але яны падобныя да злых гіен».

Прыём **«Кубік Блума»** дазваляе фармуляваць разнастайныя пытанні. Адказ на кожнае пытанне дазваляе настаўніку стымуляваць пазнавальную актыўнасць вучняў, вылучаць тыя аспекты тэмы, якія выклікаюць пэўныя цяжкасці ці складанасці.

З дапамогай гэтага прыёму вырашаюцца навучальна-пазнавальныя задачы. Грань «Назаві» мае на мэце рэпрадуктыўнае ўзнаўленне атрыманых ведаў. Грань «Чаму» дазваляе высветліць прычынна-выніковыя сувязі, узровень разумення з'явы, праблемы, героя і інш. Адказваючы на пытанні катэгорыі «Растлумач», вучань улічвае ўсе аспекты разглядаемай тэмы, тлумачыць пэўную з'яву, абставіны, паводзіны персанажа і інш. Грань «Прыдумай» прадугледжвае творчае заданне. Катэгорыя «Падзяліся» скіроўвае на аналіз і ацэнку атрыманых ведаў, закранае эмацыянальны бок асобы. Грань «Прапануй» дае магчымасць ажыццявіць самастойны пошук, прапанаваць альтэрнатыўны погляд, уласную інтэрпрэтацыю.

«Кубік Блума» можна выкарыстоўваць на ўсіх этапах урока. Аднак найбольш зручна прымяняць прыём на падагульняльных занятках, калі ў вучняў ужо ёсць уяўленне пра сутнасць тэмы.

**Комікс** — гісторыя ў малюнках, візуальная інтэрпрэтацыя літаратурнага твора. Як адукацыйны кантэнт ён валодае такімі характарыстыкамі, як лаканічнасць, лагічнасць і вобразная насычанасць. Усё гэта спрыяе рэалізацыі стратэгіі сціслага пераказу зместу твора з наступным яго абмеркаваннем. Комікс можна выкарыстоўваць для пераказу эпізодаў твора. Вучням лягчэй узнавіць змест прачытанага, абапіраючыся на выявы, якія падштурхоўваюць да ўзнаўлення дэталяў («Данік, як і кожны з малых, меў не адну, а некалькі мянушак...». Хто такі Данік Малец? Успомніце, якія мянушкі меў хлопчык. Чым вабіла Даніка школа?).

Коміксы можна аб'яднаць у інтэрактыўную кнігу і дадаць да іх заданні, створаныя пры дапамозе інтэрнэт-сэрвісу *learningApps.org*; зрабіць відэарад, які будзе мець розныя заданні, матываваць да актыўнай камунікатыўнай дзейнасці.

**Прыклад такой кнігі-комікса па творах Якуба Коласа можна паглядзець па QR-кодзе.**

*Дадатак*

**Прыклады дыдактычных заданняў**

**«На Каляды к сыну» Змітрака Бядулі**
***Пірамідная гісторыя***

| |
|---|
| Тэкля |
| старая, адзінокая |
| вёска, дарога, горад |
| стала непатрэбнай роднаму сыну |
| аддалі сына на выхаванне пану |
| спадзяванне, надзея, успамін, любоў, гонар, дарога |
| горад, прадчуванне, жаданне, радасць, гарадавы, сустрэча, разгубленасць |
| дзецям трэба шанаваць сваіх бацькоў, даглядаць іх у старасці |

QR-код

| |
|---|
| Лаўрук |
| адзіны, любімы |
| вёска, горад, дом |
| адцураўся родных каранёў, маці |
| хлопчыкам адданы ў панскую сям'ю |
| выхоўваўся, вучыўся, саромеўся, не пісаў бацькам |
| гімназія, універсітэт, адвакат, сустрэча, збянтэжанасць, не прызнаў |
| не выхоўваўся бацькамі, страціў сувязь з бацькоўскім домам |

Відэарад да ўрока (спасылка) https://youtu.be/2-4XJDMnpHM

**«Настаўнік чарчэння» Івана Навуменкі**
***Пірамідная гісторыя***

| |
|---|
| Цыркуль |
| напышлівы, старамодны |
| невялікі палескі гарадок |
| прынцыповы характар, любіў Радзіму |
| выкладаў чарчэнне, любіў лацінскую мову |
| любіў дзяцей, тлумачыў, захапляўся, выхоўваў, вучыў |
| вайна, фашысты, грабежнікі, арышт, арлы, гіены, расстрэл |
| Чалавек з такімі жыццёвымі поглядамі не быў баязліўцам |

| |
|---|
| Косця |
| надзейны, вясёлы |
| невялікі палескі гарадок |
| вучыўся, прыслухоўваўся, браў прыклад |
| задаваў пытанні настаўніку, адцягваў увагу |
| цікавіўся Авідзіем, лётнае вучылішча, развітальны падарунак |
| вайна, лётчык, матэрыял, надпіс, фізрук, настаўнік фізікі |
| Грамадзянскі абавязак кожнага — абараняць родную краіну ў час вайны |

***Кубік Блума***

| | |
|---|---|
| НАЗАВІ | 1) прадмет, які выкладаў у школе Апалінарый Феакціставіч. *(Чарчэнне.)*<br>2) прадмет, які Апалінарый Феакціставіч выкладаў у гімназіі да вайны. *(Лацінская мова.)*<br>3) прадмет, які стаў развітальным падарункам для Косці. *(Сярэбраная табакерка з надпісам на лацінскай мове.)* |
| ЧАМУ | 1) Апалінарый Феакціставіч не адмаўляў дзецям і заўсёды тлумачыў лацінскія словы? *(Настаўнік захапляўся лацінскай мовай, любіў яе.)*<br>2) фашысты застрэлілі старога настаўніка? *(Палічылі, што ён праявіў зняваґу да нямецкай зброі.)*<br>3) вучні далі настаўніку мянушку Цыркуль? *(Высокі, худы, знешне падобны на цыркуль — прадмет, патрэбны для чарчэння.)* |
| РАСТЛУМАЧ | 1) паводзіны настаўніка на ўроку, калі ён не правяраў чарцяжы, а гутарыў з дзесяцікласнікамі пра лацінскую мову, расказваў пра старажытнарымскіх паэтаў. *(Ён лічыў, што галоўнае для старшакласнікаў — «зрабіць чарцёж свайго будучага жыцця».)*<br>2) паводзіны старога настаўніка, калі фашысты гаспадарылі ў гарадку. *(Назіраючы за паводзінамі грабежнікаў, настаўнік выказаў сваю пагарду да фашысцкіх салдат. Галоўным для чалавека ён лічыў годнасць і гонар. Гэтай ісціны ён прытрымліваўся, нават калі фашысты вялі яго на расстрэл.)*<br>3) цікавасць вучняў да творчасці Авідзія. *(Настаўнік настолькі змог зацікавіць школьнікаў расказам пра асобу аўтара, што тыя захацелі прачытаць верш старажытнарымскага паэта.)* |

| | |
|---|---|
| ПАДЗЯЛІСЯ | 1) сваімі меркаваннямі пра паводзіны Косці Кветкі на ўроках Апалінарыя Феакціставіча. *(Вясёлы хлопец і добры сябра хацеў такім чынам дапамагчы аднакласнікам.)*<br>2) камічнымі момантамі з апавядання. *(Косця адцягваў увагу настаўніка ад работ вучняў; быў здзіўлены, што не ён адзін прыходзіў у бібліятэку за вершамі Авідзія.)*<br>3) сваімі ўражаннямі пра гераічны ўчынак старога настаўніка |
| ПРЫДУМАЙ | 1) тры доказы таго, што Апалінарый Феакціставіч — прыклад для сваіх вучняў. *(Настаўнік любіў дзяцей; любіў свой прадмет; яго жыццёвыя прынцыпы сталі прыкладам для пераймання.)*<br>2) тры доказы таго, што Канстанцін Кветка — годны пераемнік свайго настаўніка чарчэння. *(Канстанцін скончыў інстытут, каб выкладаць фізіку; ён не толькі тлумачыць законы фізікі, але расказвае пра патрыётаў Радзімы; дзеці любяць свайго настаўніка.)*<br>3) дыялог Косці і Апалінарыя Феакціставіча, які мог адбыцца пасля вайны |
| ПРАПАНУЙ | 1) уласнае разуменне надпісу «Радзіму сваю любім і абараняць яе павінны»;<br>2) чарцёж свайго будучага жыцця;<br>3) афармленне вокладкі кнігі «Настаўнік чарчэння» |

**Карта асацыяцый**

*https://www.canva.com/design/DAE5AeGb0Fs/Sdke7QcShrOpjmotLg-6ZQ/view?utm_content=DAE5AeGb0Fs&utm_campaign=designshare&utm_medium=link&utm_source=sharebutton*

*https://www.canva.com/design/DAE5ApDiF3Q/t5JpZh67BXXGZMq456mHvw/view?utm_content=DAE5ApDiF3Q&utm_campaign=designshare&utm_medium=link&utm_source=sharebutton*

***Відэарад*** да ўрока (спасылка) *https://youtu.be/tI2T9jMS2CU*

QR-код

**Янка Брыль «Урокі пані Мар'і»**

***Пірамідная гісторыя***

| |
|---|
| Данік |
| сірата, пастушок |
| Заходняя Беларусь, Галынка |
| хацеў вучыцца, польская школа |
| мянушкі, крыўда, школа, першы настаўнік |
| верш, Янка Купала, беларуская мова, Мікола |
| маляванне, пані Мар'я, абаранкі, хвароба, падарунак, развітанне |
| вучоба закончылася, навучыўся адстойваць права на родную мову |

***Кубік Блума***

| | |
|---|---|
| НАЗАВІ | 1) настаўнікаў Даніка Мальца. *(Пан Цаба, пані Мар'я, панна Рузя, Мікола Кужалевіч.)* |
| | 2) прычыну, па якой Данік быў вымушаны другі год сядзець у трэцім класе. *(Навучанне ў сямігодцы платнае; у школу трэба хадзіць да 14 год, інакш бацькі плацяць штраф.)* |
| | 3) імя беларускага пісьменніка, верш якога прачытаў Даніку Мікола. *(Янка Купала.)* |
| ЧАМУ | 1) пры першай сустрэчы Даніку не спадабаўся пан Цаба? *(Спачатку хлопчыку не спадабалася знешнасць гэтага чалавека; Данік адчуў яго няшчырасць.)* |
| | 2) хлопчыку хацелася чытаць кнігі на беларускай мове? *(Гэта яго родная мова, на ёй размаўлялі маці, суседзі, аднавяскоўцы.)* |
| | 3) кіраўнік мястэчковай сямігодкі адмовіўся ад здольнага вучня? *(Маці хлопчыка не магла плаціць за яго навучанне.)* |
| | 4) Данік не назваў імя таго, хто навучыў яго чытаць па-беларуску? *(Гэта пагражала Міколу арыштам.)* |

| | |
|---|---|
| РАСТЛУМАЧ | 1) з якімі цяжкасцямі ў навучанні на польскай мове сутыкнуўся Данік у школе. *(У яго не атрымлівалася вымаўляць гукі, уласцівыя польскай мове; у беларускай мове такіх гукаў няма.)* |
| | 2) за што любілі пані Мар'ю яе вучні. *(Яе ўрокі былі займальнымі і цікавымі, напрыклад, дзеці малявалі яблыкі на кляновых лістах. Настаўніца не толькі назірала і вучыла, але і сама актыўна ўдзельнічала ў працэсе, давала слушныя парады, дапамагала, а калі чытала творы дзецям, то ўкладвала ў чытанне столькі пачуццяў і асабістых адносін, што дзеці не маглі не захапіцца імі.)* |
| | 3) назву аповесці «Сірочы хлеб». *(Паступова адбывалася сталенне хлопчыка-сіраты; гэта было нялёгка, яму прыйшлося пераадольваць розныя жыццёвыя цяжкасці.)* |
| ПАДЗЯЛІСЯ | 1) сваімі меркаваннямі пра паводзіны Даніка Мальца, калі ён частаваў аднакласнікаў-беларусаў абаранкамі. *(Данік стараецца дапамагчы такім жа, як і ён, дзецям з бедных сялянскіх сем'яў: не толькі абараняе іх у спрэчках з дзецьмі з заможных сем'яў, але і частуе, калі ёсць такая магчымасць.)* |
| | 2) сваімі ўражаннямі пра ўрокі панны Рузі. *(Вучыць і нецікава, і нудна. Адзнакі запісвае ў тоўсты блакнот, які хавае ў чорную сумачку. З усіх пяці адзнак яна найбольш любіць «тры з мінусам» і за ўсё лаецца. Ад яе Данік упершыню пачуў чатыры новыя польскія словы — «матолак», «драньʼ» і «божы конь». «Часцей за ўсё стаіць каля белай кафлянай грубкі, залажыўшы назад сухія бяскроўныя рукі з пярсцёнкамі».)* |
| | 3) сваімі ўражаннямі пра ўчынак пані Мар'і, калі яна пакінула свайго лепшага вучня пасля ўрокаў. *(Пані Мар'я была сапраўдным педагогам, яна не хацела пакрыўдзіць хлопчыка. Яе пакаранне насіла выхаваўчы характар: хлопчык не выконваў заданне, а слухаў тое, што яна чытала для вучняў пятага класа. Пані Мар'я старалася выхаваць у сваіх навучэнцаў здольнасць засяроджвацца на галоўным, быць сумленнымі і паслухмянымі вучнямі.)* |
| ПРЫДУМАЙ | 1) тры доказы таго, што Данік Малец любіў сваю настаўніцу пані Мар'ю. *(Данік з замілаваннем глядзеў на яе; уважліва слухаў, што і як яна чытала; яму хацелася «схіліцца да яе рукі».)* |
| | 2) тры доказы таго, што Мікола Кужалевіч таксама настаўнік для Даніка. *(Хлопчык ідзе да Міколы параіцца; Мікола вучыць Даніка чытаць на роднай мове; дапамог зразумець жыццёвыя погляды.)* |
| | 3) кодэкс паводзін чалавека-патрыёта, на думку Даніка Мальца. *(Ведаць родную мову, вучыцца і вучыць на ёй; імкнуцца да праўды; паважаць свае погляды; жыць дзеля іншых.)* |
| ПРАПАНУЙ | 1) уласнае разуменне назвы аповесці «Сірочы хлеб»; |
| | 2) групу прадметаў-асацыяцый, па якіх можна назваць, каму з герояў твора яны належаць; |
| | 3) Даніку Мальцу верш пра любоў да роднай мовы з тых, якія вывучалі раней на ўроках беларускай літаратуры |

**Карта асацыяцый**

*https://www.canva.com/design/DAE5wcPZJsU/xRqHPgHQ3mAg3d07Y7jcqA/view?utm_content=DAE5wcPZJsU&utm_campaign=designshare&utm_medium=link&utm_source=sharebutton*

QR-код

**Прыклады коміксаў**







**Спіс выкарыстанай і рэкамендаванай літаратуры**


*Казачэнка, І. Р.* Беларуская літаратура ў коміксах / І. Р. Казачэнка // Настаўн. газ. — 2022. — 3 лют. — С. 8.

*Казачэнка, І. Р.* Кубік Блума на ўроках беларускай літаратуры / І. Р. Казачэнка // Беларус. мова і літ. — 2021. — № 7. — С. 21—23.

*Ким, О.* «Пирамидная история», или Как вызвать интерес к письму / О. Ким, Р. Вагнер // Стратегия и тактика учителя : сб. / сост. О. А. Варшавер. — М. : ЦГЛ, 2005. — С. 112—116.

*Макарова, Е. И.* Строим пирамиды. Библиотечное занятие по рассказу «Тутар» / Е. И. Макарова // Библиотека в школе. — 2008. — № 3. — С. 18—20, 29 [Электронный ресурс]. — Режим доступа: *https://lib.1sept.ru/article.php?ID=200800308*. — Дата доступа: 09.03.2022.

*Маркоўка, Ю.* Стварэнне адукацыйнага комікса: комікс-біяграфія Францыска Скарыны / Ю. Маркоўка // Роднае слова. — 2017. — № 5. — С. 84—88.

*Шаматранова, Л. К.* Кубик Блума / Л. К. Шаматранова // Рус. яз. и лит. — 2020. — № 5. — С. 24—25.